ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1986
4
СНЕЖНЯ
ЧАЦВЕР
№ 32 (1518)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

6 снежня адбудзецца VI Маскоўская раённая канферэнцыя ЛКСМ Беларусі г. Мінска. Нумар газеты прысвечаны гэтай падзеі.

Сардэчна вітаем дэлегатаў камсамольскай канферэнцыі Маскоўскага раёна!

Беларускі універсітэт

тэлетайп

УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА

Справаздачна-выбарная

канферэнцыя таварыства «Веды» універсітэта падвяла вынікі работы за мінулы навучальны год.

У плане цыкла лекцый таварыства на гэты навучальны год: «Праблемы ідэалагічнай барацьбы ва ўмовах сучаснасці» (18.XII.1986 г.), «Унутраная і знешняя палітыка ЗША і савецка-амерыканскія адносіны» (19.II. 1987 г.), «Эканамічныя адносіны Усход — Захад: рэальнасць, магчымасці, перспектывы» (19.III.1987 г.), «Становішча на Блізкім і Сярэднім Усходзе» (16.IV. 1987 г.), «Міжнародныя адносіны на Далёкім Усходзе: праблемы і перспектывы» (14.V.1987 г.).

А. САЎЧЫК.

У першынстве

абласнога савета «Буравеснік» сярод адзінаццаці каманд ВНУ прымала ўдзел і футбольная каманда БДУ. Нягледзячы на тое, што наша каманда пачала з паражэння 1:5 ад каманды політэхнічнага інстытута, у апошняй гульні, калі вырашаўся лёс прызёраў, каманда БДУ перамагла каманду політэхнічнага інстытута з лікам 4:0 і, набраўшы 33 ачкі, заняла такім чынам 1 месца. Поспех стаў магчымым дзякуючы шырокай масавасці, якую набыў футбол ва універсітэце. Праводзяцца першынствы факультэтаў у 2-х групах, масавыя спаборніцтвы па міні-футболу.

У першынстве на прыз стадыёна «Дынама» па міні-футболу універсітэт прадстаўлены шасцю камандамі. У калектыве ўдала спалучаюцца вопыт і маладосць. Вядучымі ігракамі з'яўляюцца супрацоўнікі С. Гніўко, С. Васільеў, К. Еўдакімаў, А. Глушкоў. Стабільнае майстэрства прадэманстраваў варатар каманды кандыдат хімічных навук Ю. Лосеў, які не прапусціў у 6-ці гульнях другога круга ніводнага мяча. Каманду ўзмацнілі навічкі А. Дрозд, С. Падабед, Мамі. Галоўным бамбардзірам з'яўляецца А. Глушкоў, на рахунку якога 17 галоў.

І. ЗАПРУЦКІ,
студэнт хімічнага факультэта.

ПАВЫШАЦЬ БАЯВІТАСЦЬ

Ад мінулай раённай камсамольскай канферэнцыі нас аддзяляюць два гады. Гэта быў час напружанай працы.

ГАЛОЎНАЙ СФЕРАЙ прыкладання сіл камсамола стала эканоміка. Больш як 500 маладых рабочых, падхапіўшы пачын масквічоў, прынялі павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы выканаць заданні 2-х гадоў пяцігодкі да 70-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Сярод іх: Наталля Амяльковіч — пашыўшчыца скургалантарэйнай фабрыкі імя В. В. Куйбышава, Алена Хідовіч — загатоўшчыца верху абутку цэха № 13 МВАА «Прамень», Станіслаў Стрэльчык — слесар-зборшчык цэха № 78 завода «Калібр», якія з'яўляюцца дэлегатамі канферэнцыі.

За апошнія два гады ў камсамольскіх арганізацыях раёна ўзрасла роля сацыялістычнага спаборніцтва: «Дванаццатай пяцігодцы — ударная праца, веды, ініцыятыва і творчасць маладых!» Камітэты камсамола прынялі больш напружаныя планы, вынайшлі дадатковыя рэзервы павышэння эфектыўнасці вытворчасці. З гэтай задачай паспяхова спраўляюцца ў камітэце камсамола скургалантарэйнай фабрыкі імя В. В. Куйбышава, МВАА «Прамень». Тут дыферэнцыравана падыходзяць да ацэнкі працы розных узроставых катэгорый камсамольцаў і моладзі.

Сёння пытанні якасці становяцца ў цэнтр перабудовы. У раёне 3 працэнты камсамольцаў маюць асабістае кляймо якасці. Меней 80 працэнтаў маладых рабочых здаюць прадукцыю з першага прад'яўлення. Толькі 30,6 працэнта камсамольцаў удзельнічаюць у спаборніцтве за права працаваць з камсамольскай гарантыяй якасці. Тут патрабуецца дзяржаўны падыход ад маладых.

Райком, камітэт камсамола выканалі рашэнне мінулай справаздачна-выбарнай канферэнцыі: стварылі на працягу года дадаткова па 10 КМК. Штогод фарміравалася па 20 такіх калектываў. У сучасны момант ў саставе камсамольска-маладзёжных брыгад працуе 19 працэнтаў моладзі раёна. Добрага слова заслугоўвае праца трэста сталовых і райхарчгандлю па стварэнню ўзорных КМК. Гэта стала іх канкрэтнай справай. Брыгаднай формай арганізацыі працы ахоплена значная большасць рабочых прамысловасці.

Аднак сёння на сябе звяртае ўвагу і той факт, што эфектыўнасць працы КМК не прыносіць жадаемых рэзультатаў: Выкананне заданняў нязначна вышэй планавых, невысокі ўзровень эканоміі матэрыяльных і працоўных рэсурсаў.

Атрыманы першыя вынікі працы ЧТМК: скараціўшы тэрміны праектавання больш як у два разы, маладыя інжынеры перадалі ў работу дакументацыю на машыну для ачысткі руберойду, насосныя агрэгаты, на заводзе «Калібр» завершана работа над распрацоўкай і выкананнем вопытнага ўзору святломузыкальнай установкі «Сінкрэт-4». Вось сапраўдны прыклад канкрэтнага прыкладання сіл моладзі па паскарэнню тэмпаў НТП.

У ліку важнейшых сфер дзеяння камсамольскіх арганізацый знаходзіцца школьная рэформа. Гэтаму пытанню мы надаём асаблівую ўвагу, бо болей як 60 працэнтаў камсамольскіх арганізацый раёна складаюць навучэнцы і студэнцкая моладзь.

У выніку палепшылася агульнапрацоўная падрыхтоўка вучняў непасрэдна у школе. Па заказах прадпрыемстваў вучні выконваюць вырабы больш як 50 назваў, пры гэтым іх праца звязана з вывучэннем праграмнага матэрыялу. У цэлым на вытворчасці ў мінулым годзе ажыццяўлялася прафесійная падрыхтоўка 78 працэнтаў вучняў 9—10 класаў. Усё гэта сведчыць аб тым, што саюз школы з базавымі прадпрыемствамі яшчэ больш узмацніўся.

У падрыхтоўку кваліфікаваных спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй важкі ўклад уносяць камсамольскія арганізацыі вышэйшых навучальных устаноў раёна. Болей як 800 студэнтаў узнагароджаны значком ЦК ВЛКСМ і МінВНУ СССР «За выдатную вучобу». Павялічылася колькасць імянных стыпендыятаў. Многія з іх з'яўляюцца дэлегатамі канферэнцыі.

У раёне ёсць станоўчы вопыт удзелу моладзі ў рашэнні канкрэтных вытворчых і навуковых задач, звязаных з паскарэннем навукова-тэхнічнага прагрэсу. У Белдзяржуніверсітэце ў студэнцкіх навукова-даследчых лабараторыях займаецца болей 600 будучых спецыялістаў. За мінулы год членамі СНДЛ выканана звыш 50 курсавых і дыпломных праектаў па рэальнай тэматыцы, атрымана некалькі аўтарскіх пасведчанняў, надрукаваны 34 навуковыя працы, многія з удзельнікаў сталі пераможцамі ўсесаюзных і рэспубліканскіх конкурсаў.

АД КАНФЕРЭНЦЫІ ДА КАНФЕРЭНЦЫІ

Гаворачы аб дасягнутым за справаздачны перыяд, райком камсамола адзначае, што ўсе намаганні пярвічных камсамольскіх арганізацый былі сканцэнтраваны на далейшым удасканаленні камуністычнага выхавання моладзі, умацаванні сувязі прапаганды і агітацыі з жыццём, з актывізацыяй чалавечага фактару ў вытворчай і грамадска-палітычнай дзейнасці.

Аднак аналіз паказвае, што часам ідэалагічнай рабоце не хапала дзелавітасці, канкрэтнасці Дагэтуль у асобных арганізацыях ёсць фармалізм у справе выхавання добрасумленных адносін да працы.

Марудна ажыццяўляецца перанос цэнтра агітацыі ў нізавыя звенні, на участкі, у брыгады. Патрабуе значнага паляпшэння работа па прапагандзе і распаўсюджванню вопыту перадавікоў, дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу.

Павышэнне баявітасці пярвічных камсамольскіх арганізацый у рашэнні задач эканамічнага і культурнага будаўніцтва раённы камітэт камсамола бачыць у далейшым удасканаленні арганізацыйна-палітычных форм і метадаў работы. Мы чакаем сур'ёзнай размовы аб гэтым на справаздачна-выбарнай канферэнцыі. Вельмі важна, каб на канферэнцыі была выпрацавана канкрэтная праграма дзеянняў раённай камсамольскай арганізацыі ў дванаццатай пяцігодцы, вызначана месца кожнай пярвічнай арганізацыі ў рашэнні задач сацыяльна-эканамічнага развіцця раёна і камуністычнага выхавання моладзі.

Л. ЛАГУСЕВА,
першы сакратар Маскоўскага РК ЛКСМБ г. Мінска.

Вуліцы Студэнцкія

НА МАРШЫ — СБА

23.00, калі камандзір аб'яўляў адбой, тухлі лямпачкі ў свяцільніках і наставаў час салодкага адпачынку, прыгадваліся родныя і каханыя. І хлопцы, выцягнуўшыся на раскладушках (як ні ўладкоўвайся — ногі застаюцца без «жыллёвай плошчы» — цыбаты студэнт пайшоў!), думалі пра дом, пра спатканні. Папракалі сябе за ненапісаныя лісты. «Выбачайце, заўтра, заўтра — абавязкова напішу...»

НА ЗДЫМКАХ: Расце новая вуліца ў весцы Кірава Жлобінскага раёна. Шэсць будатрадаў з медінстытута дыслацыраваліся ў мясцовай школе. Кожны вечар шэсць саветаў брыгадзіраў збіраліся, каб яшчэ лепш спланаваць працу на заўтрашні дзень, каб падумаць разам, як будаваць яшчэ хутчэй. Вось і першым жыхарам не церпіцца зірнуць на студэнцкую працу. Камісар «Шукальніка» упэўнены, з добрай усмешкай сустракае будучых гаспадароў: кватэры для іх будуюцца цудоўныя.

(Заканчэнне на 2-й стар.).

ДЗЯРЖПРЫЁМЦЫ — КАМСАМОЛЬСКУЮ ГАРАНТЫЮ

ДАЎ СЛОВА — ТРЫМАЙ!

У пачатку лістапада на Мінскай скургалантарэйнай фабрыцы імя В. В. Куйбышава ўведзена дзяржаўная прыёмка выпускаемай прадукцыі. Першым пачаў здаваць сваю прадукцыю па-новаму цэх № 3.
Расказвае начальнік цэха М. Р. Вайчук:

— НАШЫ ВЫРАБЫ — адны з самых складаных — жаночыя сумачкі. Тут неабходна ўлічваць не толькі якасць прадукцыі, але і моду. Працаваць па-ранейшаму, гэта значыць бегчы за «валам», цяпер не варта. У камісіі па дзяржпрыёмцы акрамя тэхнолагаў і спецыялістаў па стандартызацыі працуюць вопытныя мадэльеры, якія добра ведаюць густы пакупніц.

Не проста было перабудавацца, цэх жа самы вялікі на фабрыцы. Тут нам вельмі дапамаглі камсамольцы. З камсамольскай гарантыяй якасці выступіў участак маладога майстра Ірыны Сараевай. Іх ініцыятыву падтрымалі і іншыя калектывы.

На ўчастку Сараевай працуе 30 чалавек. Больш паловы — камсамольцы.

— З чаго вы пачалі? — з такім пытаннем я звярнуўся да Ірыны.

— Найперш правялі атэстацыю рабочых месц. На агульным сходзе яшчэ раз пазнаёміліся з дзяржаўнымі галіновымі стандартамі, правялі зверку выпускаемых вырабаў з існуючымі ўзорамі, вызначылі ўсе адхіленні ад нормы. Пасля гэтага разам з тэхнолагамі падумалі над удасканаленнем тэхналагічнага працэсу. Вынікі гаварыць самі за сябе — якасць прадукцыі адразу павысілася.

Гэта быў першы крок. Зараз у нас на участку ўведзены міжаперацыйны кантроль — кожны працуючы на канвееры кантралюе працу суседа. І калі ў таго здараецца брак, напарнік яго папраўляе. Галоўнае — у калектыўнай адказнасці кожнага за агульную справу.

Участак, дзе майстрам Ірына, пакуль не дасягнуў патрабуемых паказчыкаў. Планавая сортнасць у іх павінна быць дастаткова высокай: прадукцыя першага сорту займае 96,2 працэнта ад агульнай колькасці. Але, пабываўшы ў цэху, пагутарыўшы з рабочымі, я зразумеў, што ў хуткім часе яны выйдуць на намечаныя рубяжы. Людзі зацікаўлены ў якасці выпускаемай прадукцыі. У цэху добра пастаўлена інфармацыя аб праверках якасці вырабаў, аб выяўленых забракоўках. Рэгулярна вывешваюцца «Лісткі якасці», створаны і працуюць пасты якасці, у якія ўключаны лепшыя рабочыя і спецыялісты. Пачаў актыўна дзейнічаць «Камсамольскі пражэктар».

Зразумела, не ўсе праблемы пакуль вырашаны. Як сказала выконваючая абавязкі старшыні дзяржпрыёмкі М. П. Карнавухава, у цэху неабходна аператыўна замяніць старое абсталяванне. Мадэрнізацыя вытворчасці — гэта таксама сфера камсамольскага клопату. А яго ў Ірыны і яе сябровак нямала. Паспяховая праца ва ўмовах дзяржпрыёмкі магчыма толькі тады, калі ўсе пытанні будуць вырашацца комплексна. Парукай таму павінна стаць камсамольская гарантыя якасці. Даў слова — трымай яго!

Ч. ВІКТАРАЎ.

РАЎНЕННЕ — НА ГЕРОЯЎ

Жыццё, адданае Радзіме

1 снежня 1986 года споўнілася 90 гадоў з дня нараджэння Георгія Канстанцінавіча Жукава, вядомага палкаводца, аднаго з актыўных будаўнікоў Узброеных Сіл СССР, Маршала Савецкага Саюза, чатырыжды Героя Савецкага Саюза.

ЗНАЧНЫ час у 20—30-я гады Г. К. Жукаў праходзіў ваенную службу ў Беларусі. Тут ён камандаваў палком, брыгадай, дывізіяй. У ліпені 1938 года быў назначаны намеснікам камандуючага войскамі Беларускай Асобай ваеннай акругі.

Г. К. Жукаў у 20-я гады працаваў выкладчыкам БДУ. З'яўляючыся камандзірам-камісарам 39-га Мелякеска-Пугачоўскага кавалерыйскага палка VII Самарскай кавалерыйскай дывізіі, ён з вялікім жаданнем пайшоў насустрач просьбе рэктара універсітэта прафесара У. І. Пічэты, згадзіўшыся чытаць студэнтам першай у рэспубліцы ВНУ курс лекцый па вышэйшай пазавайсковай падрыхтоўкі. На працягу шэрагу гадоў умела спалучаў камандаванне палком з выкладчыцкай працай.

Яго актыўная дзейнасць на кафедры ваеннай падрыхтоўкі адыграла станоўчую ролю ў разгортванні ва універсітэце абаронна-масавай работы. У многіх студэнтаў яго лекцыі і практычныя заняткі не толькі абуджалі жаданне па-сапраўднаму авалодваць ваеннай справай, але і выхоўвалі ў іх пачуццё грамадзянскага абавязку перад Радзімай.

У той час калі Георгій Канстанцінавіч вучыў студэнтаў ваеннай справе, яны, у сваю чаргу, пад кіраўніцтвам выкладчыкаў дапамагалі 39-му Мелякеска-Пугачоўскаму палку весці вялікую работу па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці сярод чырвонаармейцаў, выступалі перад воінамі з лекцыямі і дакладамі, праводзілі сумесныя вечары мастацкай самадзейнасці, умацоўвалі шэфскія сувязі...

Актыўная грамадская дзейнасць выкладчыкаў і студэнтаў у справе аказання дапамогі палку атрымала высокую ацэнку і ўдзячнасць камандавання часці. Г. К. Жукаў ад імя асабовага саставу падзякаваў калектыву універсітэта за развіццё ваенна-шэфскіх сувязей у прывітальнай тэлеграме, адрасаванай рэктару БДУ У. І. Пічэце, і пажадаў новых поспехаў у гэтай важнай рабоце.

І. МАРЧАНКА,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт.

НА МАРШЫ — СБА

Вуліцы Студэнцкія

НА ЗДЫМКАХ: Пад'язджае кран і — раз! — у адзін момант цэлы дах з'яўляецца на доме. Бывала, прыйдзеш праз гадзіну — і вуліцу не пазнаеш. А пасля працы ў харчэўні «Волат» мякчэла сэрца самага строгага мужчыны ЛСА «Шукальнік». Якія толькі стравы дзяўчаты не гатавалі!
Усе было ў атрадзе: і праца, і адпачынак. Выкладваліся хлопцы поўнасцю. Вось і на ніжнім здымку — хвіліна вольнага часу. Пройдзе яшчэ дзве-тры мінуты, камандзір скажа: «Пойдзем!» І зноў пачне расці вуліца Студэнцкая. І так да апошняга будатрадаўскага дня.

Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.



КРОК У ПРАФЕСІЮ

15 педагагічных атрадаў існуе на факультэце дашкольнага выхавання Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага.

«Дзень добры, дзеці!»

ЗДАЕЦЦА, для студэнтаў гэта справа вядомая. Некаторыя з іх ужо не першы год з'яўляюцца байцамі педагагічных атрадаў. І ўсё ж... Непаразуменні, нявырашаныя пытанні заўсёды знойдуцца. «Не трэба іх чакаць, а потым спасылацца на так званыя надзвычайныя абставіны»,— палічылі ў камітэце камсамола інстытута і вырашылі як мага болей увагі надаваць рабоце па падрыхтоўцы камандзіраў і камісараў.

У мінулым годзе адбылося 12 пасяджэнняў актыву педагагічных атрадаў. Але, згадзіцеся, справа не толькі ў колькасці і нават зусім не ў ёй. Наўрад ці хто з актывістаў запомніў дакладную лічбу і дату, калі праходзілі пасяджэнні, а ведамі, якія ў той час атрымалі, безумоўна, карыстаюцца ў арганізацыі працы атрадаў кожны дзень.

Для першакурснікаў такія сустрэчы — сапраўдныя знаходкі. Дзе, як не тут, можна даведацца, у чым заключаецца спецыфіка працы педагагічнага атрада ў дашкольнай установе, пазнаёміцца са структурай атрада, правіламі складання планаў работы...

А іменна пра гэта гаварылася на першых пасяджэннях актыву. Тут можна атрымаць таксама і кансультацыі метадычнага характару: як арганізаваць і правесці гульні ў групах ранняга ўзросту, як скласці планы вучэбных заняткаў. Гэтыя веды будучым педагогам і тым, хто яшчэ толькі марыць стаць студэнтам педагагічнага інстытута, не толькі ў час вучобы, але і ў наступнай дзейнасці спатрэбяцца.

Так, на пасяджэнні прыходзяць не толькі студэнты, але і школьнікі старэйшых класаў. Пабываўшы тут аднойчы, многія застаюцца працаваць разам са студэнтамі. Такім чынам, педагагічны атрад — гэта яшчэ і аб'яднанне, дзе ідзе знаёмства з абранай прафесіяй.

Але галоўная задача атрада ўсё ж — праца з дзецьмі. Спартыўныя святы, экскурсіі па гораду, сюжэтна-ролевыя гульні — вось далёка не поўны пералік таго, што праводзілі байцы педатрадаў.

А далей былі вынікі. Аб іх можна меркаваць ужо, даведаўшыся пра тое, што, напрыклад, 401 група зрабіла 950 элементаў раздатачнага матэрыялу. Дзякуючы ініцыятыве байцоў многіх педатрадаў з'явілія ў дзіцячых садах самыя што ні на ёсць сапраўдныя лялечныя тэатры. І тыя ж умелыя рукі ператварылі ў «модніц» звычайных лялек, «вылечылі» цацкі, падклеілі кнігі.

Што дае самім байцам педагагічны атрад? За адказам, лічу, далёка ісці не трэба: гэта праверка на сталасць, для некага — першыя крокі, для іншых — ужо пачаты шлях. Ведаю і тое, што стаць сапраўдным спецыялістам, не зведаўшы практыкі, немагчыма. Мне здаецца, што з гэтым меркаваннем згодны ўсе байцы педагагічных атрадаў. І ў першую чаргу тыя, хто працаваў добрасумленна. А такіх, упэўнена, было шмат.

Ж. ДАНІЛЬЧЫК.

ТВОРЧЫЯ АБ'ЯДНАННІ

«Цяжка, але і цікава» — так лічаць члены ЧМТК

У Мінскім філіяле Усесаюзнага навукова-даследчага інстытута будмантажінструментаў атрымаў у красавіку прапіску часовы маладзёжны творчы калектыў. Наш карэспандэнт А. ЛІПАЙ гутарыць з людзьмі, якія з'яўляюцца «віноўнікамі» нараджэння гэтага творчага аб'яднання.

— АДМІНІСТРАЦЫЯ падтрымала ідэю маладых інжынераў аб'яднаць іх творчыя намаганні, — гаворыць Леў Гендзілевіч, старшыня савета маладых вучоных-спецыялістаў, адзін з ініцыятараў стварэння маладзёжнага калектыву.— Справа гэтая была патрэбна ўсяму інстытуту.

Леанід Лашнец, інжынер-канструктар І катэгорыі, кіраўнік ЧМТК, расказвае аб цяжкасцях, з якімі прыйшлося сутыкнуцца калектыву:

— На маю думку, нельга лічыць, што ідэя не ўдалася. Прапаную і ў наступным годзе стварыць такі калектыў у нашым інстытуце. І ўсё ж... Без цяжкасцей не абышлося. Як іх пазбегнуць? Не вельмі складана. Трэба толькі своечасова спланаваць работу ЧМТК, вызначыць састаў. Не памылюся, калі скажу, што іменна з-за гэтага ўзнікалі ў нас праблемы. Загадзя не было вызначана, хто будзе працаваць у творчым калектыве, і таму рабіць гэта давялося ў спешцы. Да таго ж, інжынераў, якія пажадалі ўвайсці ў састаў ЧМТК, трэба было «адваёўваць» у загадчыкаў аддзелаў. І справа тут не толькі ў іх інертнасці ці нежаданні падтрымліваць творчую ініцыятыву маладых: план даведзены на кожнага супрацоўніка аддзела, а тут інжынера на тры месяцы (іменна столькі існаваў ЧМТК) «забіраюць». Ды і энтузіястам спачатку нялёгка было: інжынерам Таццяне Басавай, Алене Шкараднай, Ганне Чарняўскай, Галіне Манышінай, Любові Горавай прыходзілася працаваць іншы раз да ночы. Затое і вынік атрымаўся добры: створаны новыя насосныя агрэгаты, удасканалены машыны для перамоткі і ачысткі рулонных матэрыялаў.

Мяркуемы народнагаспадарчы эфект ад укаранення дэталей і машын, створаных па чарцяжах ЧМТК, складзе болей 377 тысяч рублёў.

ГУЛЬНЯ? НЕ ТОЛЬКІ!

З ЭВМ НА «ТЫ»

Зусім нядаўна, здаецца, з'явіўся ў нашым ужытку выраз «усеагульная камп'ютэрная адукаванасць». І гэта не выпадкова, бо жыццё з кожным годам патрабуе ад нас усё большага. Зараз немагчыма ўявіць сабе народную гаспадарку без камп'ютэраў, робатаў... Нарэшце і ў раскладах заняткаў школ з'явілася новая дысцыпліна «Асновы інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі».

СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА № 12 здаецца звычайнай. І адрозніваецца ад іншых хіба тым, што адна з лепшых не толькі ў раёне, але і ў горадзе. І амаль самае галоўнае, чым яна ганарыцца,— выкладанне курса асноў інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі. У школе ёсць спецыяльны тэхнічна абсталяваны кабінет, у якім вучні замацоўваюць атрыманыя на тэарэтычных занятках веды.

А пачыналася усё два гады назад. Спачатку, як гэта найчасцей адбываецца, знайшліся людзі, якія «загарэліся» цікавай прапановай. Не было тэхнікі, не было і сапраўднага спецыяліста, які, дарэчы, хутка знайшоўся. Атрымаўшы неабходную падрыхтоўку, за справу ўзялася маладая настаўніца матэматыкі камсамолка Жанна Пятроўна Караваева.

Настаўнікі не вельмі ахвотна бяруцца за выкладанне новай дысцыпліны. Зразумела, справа новая, невядомая: а што, калі нічога не атрымаецца? І сапраўды, не адразу ўсё само па сабе зрабілася.

Няпроста было набываць неабходную тэхніку: мікракалькулятары, камп'ютэры. У хуткім часе тут дапамаглі шэфы: навукова-даследчы інстытут прыкладных фізічных праблем і радыёфізічны факультэт БДУ імя У. І Леніна. З удзячнасцю гаворыць аб іх дырэктар СШ № 12 Кацярына Пятроўна Пятруша:

— Усю апаратуру, а ў нас выкарыстоўваецца 10 камп'ютэраў, мы атрымалі ад шэфаў. Дапамагаюць яны нам і ў іншых справах: рамантуюць абсталяванне, рэгулююць апаратуру. Студэнты II курса факультэта радыёфізікі і электронікі ў нас вельмі частыя госці ці, лепш сказаць — гаспадары. Яны складаюць вучэбныя праграмы па матэматыцы, самі тлумачаць школьнікам незразумелае.

А як ставяцца да новай дысцыпліны школьнікі? Адказ быў адназначны — з вялікай цікавасцю. Спачатку курс, асабліва практычная яго частка, быў чымсьці накшталт новай гульні. З той розніцай, што цацкі ў ёй вельмі ўжо сур'ёзныя — камп'ютэры. Хіба можа пакінуць абыякавым школьніка экран, пульт кіравання з радкамі клавішаў, у якіх тоіцца вялікая сіла — думка!.. Зараз дзеці зразумелі, што маюць справу з вельмі сур'ёзнымі рэчамі. Кожны вучань старэйшых класаў умее карыстацца мікракалькулятарам, самастойна складае праграмы.

— На гэтым можна было б і спыніцца,— гавару я, але Ж. П. Караваева не згаджаецца:

— Нядаўна ўбачыла ў Маскве на ВДНГ СССР цікавую навінку. Камп'ютэры ДВК, злучаныя з установкай ДВК-2, якая мае «памяць», што дазваляе набіраць на ўсіх машынах праграмы і фіксаваць іх. Эфект даволі вялікі, ды і зрабіць гэта ў нас няцяжка. Трэба толькі ўзяцца за справу належным чынам.

Што і казаць, цікавы вопыт у СШ № 12. Шкада толькі, што пакуль нямнога ў яе паслядоўнікаў. А перспектыва ў гэтай справы вялікая. Няхай не кожны вучань абярэ потым для сябе спецыяльнасць, звязаную з электронікай або вылічальнай тэхнікай, але асноўныя веды па гэтых галінах неабходны кожнаму сучаснаму чалавеку.

Н. БАГДАНОВІЧ.

АКТЫВІСТ

СТАН ДУШЫ

За дзвярыма з шыльдачкай «Малады дзяржынец» чуліся грукат малатка, вішчанне пілы і яшчэ нейкія, зусім незнаёмыя гукі. Здавалася, я апынуся не ў штабе атрада, а ў сталярнай майстэрні.

Адчыніла сімпатычная дзяўчына з малатком у руках. Усміхнулася:

— Заходзьце, мы тут афармленнем стэндаў займаемся.

Так я і пазнаёміўся з сакратаром камітэта камсамола СПТВ-40 кінамеханікаў Аленай Валадзько.

СПРАЎ У АЛЕНЫ шмат. І кожная з іх — галоўная. Ужо з самай раніцы клопатаў і турбот — не пералічыць.

— Яшчэ і да кабінета свайго не дойдзеш, дзе, на думку многіх, і павінен пачынацца працоўны дзень,— нагадвае Лена, а вакол так і сыплюцца пытанні адно за другім: «Як вечар адпачынку правесці? Як пратакол сходу афармляць, заяву напісаць?». Кожнага трэба выслухаць, кожнаму растлумачыць.

Безумоўна, знайсці некалькі мінут для грунтоўнай размовы цяжка, часам нават немагчыма, але Лена нейкім чынам усё паспявае.

Дарэчы, яна ўжо доўгі час лічыць, што працаваць трэба, у першую чаргу, з людзьмі. Бо ад іх жадання, ініцыятывы многае залежыць. Таму пра сябе Лена гаворыць мала. І пра што ні ішла размова: цяжкасці ці поспехі,— заўсёды на твары сакратара добрая ўсмешка.

Не адразу знайшла Лена спосаб барацьбы з прагульшчыкамі і парушальнікамі дысцыпліны. Але шукала, спрабавала, памылялася і ў выніку знаходзіла агульную мову. Мабыць, за тое, што ў самых заблытаных справах умее яна адшукаць «правых» і «вінаватых», што не застаецца без канкрэтнага адказу ні адно пытанне, што ніхто не зможа лепш за яе знайсці тэму для вечара і ператварыць сваю думку ў справу — і лічаць навучэнцы СПТВ-40: з Ленай лёгка і цікава працаваць.

Такое не ў кожнага атрымаецца. У чым справа?

— У стане душы,— адказвае дзяўчына.— На маю думку, педагог (а Лена марыла яшчэ ў дзяцінстве пра тое, што будзе выкладаць эстэтыку) — гэта не проста прафесія.

Таму і паступіла яна пасля школы на філасофскае аддзяленне гістарычнага факультэта БДУ. Вучылася завочна, працавала на трактарным заводзе і выконвала абавязкі сакратара камсамольскай арганізацыі аддзела знешняй кааперацыі. У 1985 годзе прыйшла працаваць у вучылішча. Спачатку паспрабавала сумяшчаць адначасова і выкладчыцкую дзейнасць, і работу сакратаром камсамольскай арганізацыі. А потым вырашыла займацца нечым адным. Абрала камсамольскую работу. І лічыць, што не памылілася.

— Ад кожнай добраарганізаванай справы адчуваеш маральнае задавальненне,— гаворыць Лена. Да таго ж, у кожнай справе вялікую ролю адыгрывае асоба арганізатара. Вось цяперашнія другакурснікі яшчэ ў мінулым годзе былі, здаецца, самымі пасіўнымі, а да дня нараджэння камсамола такі вечар арганізавалі, што да гэтага часу ўсё вучылішча ўспамінае.

Пра дасягненні сваіх камсамольцаў Лена гатова гаварыць бясконца. І пра тое, якіх поспехаў у вучобе дасягнулі, і пра тое, як сталейшымі ў думках і поглядах становяцца...

Гляджу на яе і прыходжу да думкі, што сакратар — таксама няпростая прафесія — гэта стан душы.

В. ЧАРНЯКОЎ.

ПАЗІЦЫЯ

Выхоўваць грамадзянскасць

Ёсць на механіка-матэматычным факультэце такая традыцыя: на справаздачна-выбарнай камсамольскай канферэнцыі кожная група атрымлівае калектыўнае заданне. «Справы павінны быць канкрэтнымі, сур'ёзнымі, патрэбнымі,— лічыць сакратар камітэта камсамола мехмата Вольга Жук.— Яны дапамагаюць нам сталець, станавіцца самастойнымі. Адчуць сябе асобай». Летапіс факультэта, куды ўпісваюцца ўсе самыя значныя справы студэнтаў, можа расказаць аб стварэнні гурткоў і камп'ютэрнага класа ў 170-й мінскай школе, аб удзеле ў арганізацыі гарадскога маладзёжнага клуба, аб шэфстве над Клецкім дзіцячым домам і шпіталем у Бараўлянах... Запоўнены ўжо многія старонкі, але спраў не ўбаўляецца. Проста самі рабяты пастаянна знаходзяць новыя. Ім слова.

Вольга РАМАНЧЫК:

— Калі да нашага курса звярнуліся з прозьбай дапамагчы афганскім студэнтам, адклікнуліся многія: Лена Більдзюк, Вольга Вараб'ёва, Лена Трушына... Набралася група з дванаццаці чалавек. Два разы на тыдзень мы хадзілі ў пяты інтэрнат і займаліся з нашымі афганскімі сябрамі. Ім вельмі хацелася вучыцца, атрымаць адукацыю. Веды, з якімі яны прыехалі на падрыхтоўчае аддзяленне, былі даволі слабыя, а краіне — яны разумелі гэта — вельмі патрэбны высакакласныя спецыялісты. Мы дапамагалі ім ад усёй душы. Хтосьці блытаўся ў табліцы множання, нехта ва ўраўненнях, але крок за крокам ліквідаваліся прабелы, незразумелага станавілася ўсё менш. Паралельна вывучалі і рускую мову. Бо ў аўдыторыі народу многа і не заўсёды яны ўсё паспявалі схапіць. А тут індывідуальныя заняткі.

Мы гарталі не толькі старонкі падручнікаў, але і расказвалі ім гісторыю краіны Кастрычніка, біяграфію Леніна. Анвар, з якім я займалася, быў літаральна захоплены подзвігам Ленінграда і пры першай жа магчымасці паехаў туды на экскурсію. Я зразумела: людзі, перажыўшыя блакаду, блізкія і дарагія маладому афганцу. Бо Анвар таксама ведае, што такое вайна і гора, ён са зброяй у руках абараняў заваёвы красавіцкай рэвалюцыі. Анвар верыць, што яго краіна пераадолее адсталасць.

У канцы навучальнага года нашы сябры запрасілі нас на вечар савецка-афганскай дружбы. Яны раз'язджаліся вучыцца ў розныя гарады. «Вялікае дзякуй» толькі і чулася. Думаю, зразумець наш народ, нашу краіну дапамаглі ім і мы.

Таццяна МАЦКЕВІЧ:

— А мы будавалі дзіцячыя пляцоўкі ў мікрараёне Паўднёвы Захад. На іх добраўпарадкаванні працуем і цяпер. І дапамагаюць нам у гэтым навыкі і загартоўка, атрыманыя ў «Стэлуцы», самым вядомым на мехмаце будатрадзе. Многія працоўныя справы факультэта існуюць як працяг яго добрых традыцый.

«Стэлуца» — у перакладзе з малдаўскай зорачка. У апошнія гады атрад дыслацыраваўся ў Ізабільненскім раёне Стаўрапольскага краю. Месцам прапіскі стаў саўгас Цішчанскі. Тры разы я была байцом атрада (у апошні год — камандзірам).

Працавалі на палях саўгаса. За дзень выконвалі па дзве нормы, аказвалі шэфскую дапамогу сельскай школе, дзіцячаму саду. Помняць вяскоўцы нашы канцэрты, свята ўраджаю, медыум, карнавал. Ганаровым байцом атрада мы залічылі былога выкладчыка універсітэта Героя Савецкага Саюза А. В. Кірсанава. Грошы, зароблены на яго імя, пералічылі ў Фонд міру. Ад старэйшых курсаў да малодшых перадаецца дух «Стэлуцы», дух таварыства, узаемавыручкі. І ён спадарожнічае нам усюды, за якую б справу мы ні ўзяліся.

Каця АХОТНІКАВА:

— Вучняў 104 сярэдняй школы г. Мінска, у якой я вучылася, звязвае вялікая дружба з былымі партызанамі атрада імя Камсамола. У школьным музеі баявой славы ёсць стэнд, прысвечаны гісторыі атрада, захоўваюцца многія яго рэліквіі. Да нас часта прыходзілі Павел Сяргеевіч Вараб'ёў, Зінаіда Харытонаўна Святкіна, Уладзімір Сцяпанавіч Сянчук... Яны былі ўдзельнікамі нашых камсамольскіх сходаў, дыспутаў, самых урачыстых падзей. Мы заўсёды чакалі іх як самых дарагіх гасцей. Увесь наш клас вельмі даражыў дружбай з ветэранамі. Яшчэ б! Калі мы пайшлі ў Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, убачылі там пушку, адбітую атрадам у праціўніка. А на адным са сходаў Павел Сяргеевіч, былы камандзір атрада, уручыў нам сваю толькі што выдадзеную кнігу «Імя Камсамола».

Хадзілі мы і дарогамі атрада. У Пудзіцкай Слабадзе Пухавіцкага раёна камсамольцы МЗВТ аднаўляюць партызанскі лагер. Адкрыццё зямлянак стала сапраўдным урокам мужнасці. Партызанскі калодзеж, помнік... Многія не маглі стрымаць слёз. Гэта месца стала свяшчэнным. Цяпер тут гучаць клятвы на вернасць Радзіме, тут прымаюць у камсамол, тут праходзяць маршруты многіх паходаў. А тады — нават цяжка ўявіць — палалі вёскі, а яны — крыху старэйшыя за нас — змагаліся з ворагам, адстойвалі родную зямлю.

Вось аб гэтым усім я і расказала сваёй групе. Мы вырашылі вывучаць гісторыю атрада імя Камсамола. Гэта і будзе нашым заданнем. Вырашылі арганізаваць паход у Пудзіцкую Слабаду, дапамагчы ў аднаўленні зямлянак. Мы ведаем: гэта дапамога патрэбна. І перш за ўсё нам самім.

Запісала Н. РОШЧЫНА.

КРОКІ ПАМЯЦІ

ПА ПАТРЫЯТЫЧНАМУ КОМПАСУ

— Э-ГЭ-ГЭЙ!

Мокрымі камякамі б'е ў твар і грудзі снег. Берагі — і наш, і супраць-леглы — белыя, а пасярэдзіне вялізнай чорнай вужакай павольна паўзе Днепр. Яшчэ ўчора мы любаваліся яго прыгажосцю, а сёння ён для нас ужо сапернік. Дзве гадзіны ад Засценкаўскай сярэдняй школы да былой пераправы каля вёскі Расасна моўчкі вёў нас трынаццацігадовы праваднік Сяржа Ляўцараў. Яго адправіў з нагадаванне. Усякае было тады, але і яму запомніліся такія ж сустрэчы, калі мясцовыя жыхары гатовы былі аддаць апошняе. Толькі б перамагчы ворага, толькі б дачакацца вызвалення.

Аднак мы вырашаем ісці далей. І зноў дым вогнішча, смачная-смачная рысавая каша і цёплая палатка... Які турыст, седзячы дзенебудзь ва ўтульнай кватэры, не марыць аб усім гэтым? І якімі дзіўнымі здаюцца гэтыя мары для таго, хто ніколі не адчуваў прыемнага цяжару рэчавага мяшка, хто лічыць за лепшае праводзіць свой вольны час ля тэлевізара. Колькі разоў даводзілася чуць: «Навошта вам гэтыя цяжкасці? Хіба не можна паглядзець тыя ж самыя мясціны ў «Клубе падарожнікаў»? Сядзіш сабе з камфортам, каву папіваеш. А вы?..»

А мы ідзем, сагнуўшыся пад рэчмяшкамі, і адчуваем шчасце. Шчасце ад гэтай ношкі, шчасце ад таго, што пасля паходу зусім іншым здаецца гарадское жыццё, шчасце, што побач з табой надзейныя таварышы. Бо яны праверaны гэтымі цяжкасцямі. Яны твае, родныя. І зусім па-іншаму ўспрымаеш у паходзе прыроду, гістарычныя месцы, помнікі.

Мемарыяльны комплекс «Рыленкі» ля самай аўтастрады Мінск — Масква. Можна было без усялякіх цяжкасцей прыехаць на аўтобусе і паглядзець яго. Мы дабраліся сюды пешшу. Мы спыніліся перад уваходам і паглядзелі на суровыя і мужныя твары савецкіх воінаў. Хацелася сказаць ім: «Мы прайшлі вашай дарогай, бацькі і дзяды. Мы дакрануліся сэрцам да вашай памяці».

Мы помнім Героя Савецкага Саюза радавога Юрыя Смірнова. На гэтай зямлі фашысцкія каты распялі яго на бліндажы. У галаву, ногі, рукі забілі цвікі, цела зрэзалі нажамі. Але юнак не выдаў ваенную тайну.

Мы помнім Аляксандра Васільева, які сваім целам закрыў амбразуру варожага дзота. Мы помнім лётчыкаў авіяпалка «Нармандыя — Неман» С. Астахава і Бруна дэ Фальтана, якія загінулі ў адным самалёце.

Помнікі, помнікі... Дзевяць месяцаў грудзі ў грудзі стаялі тут нашы і нямецкія войскі. Колькі дзяцей магло з'явіцца за гэты час на свет! Але людзі не думалі пра гэта, яны знішчалі адзін аднаго. І падымаліся брацкія магілы: Ляды — 142 воіны, Краснае — 374, Чырвоная Слабада — 871. І знікалі з твару зямлі цэлыя вёскі: Усвяты — знішчана разам з жыхарамі, Новае Сяло — знішчана ў верасні 1942 года, Карагінава — не існуе...

Прозвішчы на мемарыяльных плітах. Дзесяць тысяч іх на брацкай магіле ў Рыленках! Мы стаялі, схіліўшы галовы перад гэтымі прозвішчамі і хацелася крыкнуць на ўвесь зямны шар: «Людзі, памятайце! Памятайце пра тых, хто аддаў жыццё сваё дзеля вас. Дакраніцеся сэрцам да гэтай свяшчэннай памяці!»

С. ПЛЫТКЕВІЧ,
кіраўнік паходу,
студэнт факультэта
журналістыкі.

Фота АЎТАРА.

мі дырэктар школы Анатоль Георгіевіч Каранеўскі. Сяржка клыпаў наперадзе, як быццам якую важную работу рабіў, абыходзіў калюгі, не азіраўся, не гаварыў ні слова. І цяпер пастаяў хвіліну каля Дняпра, паказаў лодку на супрацьлеглым беразе і пашыбаваў дадому нацянькі па ўснежанай ралі. Да Расаснянскага школьнага музея, да настаўніка гісторыі Мікалая Шкадава заставалася нейкіх метраў пяцьсот, але між намі ляжаў Днепр...

— Э-гэ-гэй!

Вёска як вымерла. Мокрыя сняжынкі ліпнуць да галінак кустоў, сыплюцца на раллю, імгненна знікаюць у мутнай вадзе Дняпра. Пераправіцца надзеі ніякай. Сустрэчу з Мікалаем Шкадавым прыйшлося адкласці на потым...

Два гады назад узнікла гэта задума — арганізаваць Зорны паход па месцах баявой славы 93-га гвардзейскага Аршанскага Чырванасцяжнага ордэна Аляксандра Неўскага артылерыйскага палка. Некаторыя з сённяшніх удзельнікаў паходу прыбылі тады ў якасці маладых салдат у артылерыйскае падраздзяленне, якое было арганізавана на базе гэтага палка. Зайшлі ў пакой баявой славы — сціплая экспазіцыя: амаль голыя сцены, экспанаты можна па пальцах пералічыць. А чалавек жа павінен ведаць свае карані, свой род, справы бацькоў і дзядоў. Для салдата баявы шлях часці — як для народа яго мінулае. Сёння кожны воін абавязаны ведаць імёны тых, хто ў цяжкую гадзіну аддаў сваё жыццё за яго, за кожнага з нас. Прыкладна так думалі мы, калі збіраліся ў Зорны паход. У падраздзяленні стваралі музей баявой славы, патрэбны былі экспанаты...

3.10.43.

«У 11.00 пры праследаванні эшалонаў палка праз Смаленск атрыманы загад камандуючага артылерыяй аб змяненні маршруту: палку сканцэнтравацца ў раёне станцыі Красны Бор у пяці кіламетрах на захад ад Смаленска і паступіць у састаў артылерыйскіх часцей узмацнення 31-й арміі».

(З кнігі «Баявы шлях часці»).

Мы таксама вырашылі пачаць свой паход са Смаленска. Нельга было абмінуць гэты слаўны горад-герой, не паглядзець яго гістарычныя месцы. Старажытнасцю дыхаюць яго крапасныя сцены, нагадваюць аб гераічным мінулым помнікамі героям Айчыннай вайны 1812 года і Вялікай Айчыннай.

7 лістапада. Пасля экскурсіі па гораду група выязджае ў выходны пункт — на правы бераг Дняпра ля вёскі Катынь. За вокнамі мільгаюць шматпавярховыя будынкі станцыі Красны Бор. Што думалі аб гэтай вёсцы салдаты палка тады, сорак тры гады назад? Яны адсюль пачыналі наступленне, і для многіх з іх яно было апошнім — для нас гэта звычайная, невядомая раней станцыя...

НА ПЕРШЫ начлег мы сталі на беразе Дняпра. Па-сапраўднаму першым ён быў толькі для Алены Бачук і Светы Шульгі. Астатнія ўжо ўдзельнічалі ў паходах: Андрэй Максімаў з Ліліяй Сурвіла пабывалі ў Карпатах, Валера Кароль і Лена Гойтан хадзілі па Беларусі. Але і навічкам, і бывалым турыстам нязвыкла было 7-га лістапада расчышчаць ад снегу месца для палаткі. А ён сыпаў, сыпаў на лес, на поле, на вогнішча. Мы знаёміліся. Раней, хоць і вучыліся на адным факультэце, але па-сапраўднаму так і не ведалі адзін аднаго. А сёння ўжо сталі адзінай турысцкай групай. І гэты лагодны, мяккі снег рабіў нас пакрыху сябрамі. Добра было ля вогнішча, недзе ў цемры поўз Днепр, раз-пораз на шашы гулі машыны і... не хацелася ісці ў палатку...

17.10.43.

«У час налёту варожай авіяцыі на агнявой пазіцыі другой батарэі (раён вёскі Засценкі) ад скінутай бомбы ўзнік пажар. Наводчык гвардыі малодшы сяржант А. Крандзясаў і зараджаючы радавы І. Мамутаў пад разрывамі бомбаў ліквідавалі пажар, тым самым выратавалі 500 снарадаў і забяспечылі бесперабойную работу батарэі».

(З кнігі «Баявы шлях часці»).

У першы дзень мы зрабілі сапраўдны марш-кідок. Хацелася паглядзець, хто на што здатны. Хлопцаў, праўда, ведаў раней, у іх быў упэўнены. А вось дзяўчаты... Яны, відаць, усё зразумелі. І крочылі, крочылі... Здавалася, таксама рашылі праверыць свае сілы. На стаянку спыніліся ўжо ў поўнай цемры. Але сэрца радавалася: у групе не знайшлося ні ныцікаў, ні гультаёў.

Вёска Засценкі... Здалёк убачылі двухпавярховы будынак школы. Узіраліся наўкол: дзе тут магла стаяць другая батарэя? Дзе малодшы сяржант Крандзясаў і радавы Мамутаў змагаліся з агнём? Цішыня, толькі на палявой дарозе ракоча трактар з прычэпам.

Крыху пазней жыхарка вёскі Новая Тухіня, заслужаная настаўніца БССР Марыя Мікалаеўна Шабурава расцлумачыла, што з лістапада 1943 года па чэрвень 1944 года на гэтых мясцінах праходзіла лінія фронта. Тут была мёртвая зона, ад вёсак не засталося нічога, жыхароў немцы выгналі, будынкі разабралі, дрэвы выкарчавалі. Гэта — каб не было ніякіх арыенціраў. Таму палкавы пісар і напісаў: «У раёне вёскі Засценкі». Вёскі самой на той час ужо не было. Немцы ўгрызліся тут у зямлю, нарабілі дзотаў і агнявых кропак. Яны спадзяваліся тут спыніць наступленне савецкіх войск... Спадзяваліся.

СТАНЦЫЯ Кірыёва. Вось сем гадзін вечара. Электрычка прагрукатала хвіліну і знікла. Два ліхтары ледзь прасвечваюцца праз снежную каламуць. Прыгажосць казачная, настрой ва ўсіх прыўзняты, бы перад Новым годам. Ліля Сурвіла распораз усклікае: «Дзяўчаты, зірніце, як усё гэта цудоўна!» Мы пераступаем асцярожна наперад, баімся, каб не згубіць у цемры дарогу: жанчына-«стрэлачніца» папярэдзіла, што тут з абодвух бакоў балота. Заходзім у Кірыёва. Праз некалькі хат з цемры ўзнікла бабулька, убачыла нас, пляснула ў ладоні:

— Ай, мае дзетачкі, ай, мае галубочкі! Куды ж гэта вы ідзяце на ноч гледзячы?

Нашы тлумачэнні ёй ніяк не зразумець...

— Заставайцеся ў мяне начаваць, і месца ёсць, і бульбачку пастаўлю.

Мы спыняемся, і становіцца крыху няёмка за сваю паспешлівасць. На памяць усплываюць расказы дзядулі пра партызанскае юнацтва. Яны спадзяваліся тут спыніць наступленне савецкіх войск... Спадзяваліся.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

4 снежня 1986 года

АТ 07686. Зак. 1522.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4 ПАКОІ 72-73. ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. И. ВАРАБ'ЁЎ.